**З пісьма членаў праўлення калгаса «Кызыл Маяк» Горна-Алтайскай аўтаномнай вобласці. 13 верасня 1948 г.**

Мы звяртаемся да Вас з просьбай растлумачыць, у чым прычына, што тут у нас з году ў год увесь ураджай даводзіцца здаваць, не размяркоўваць ні грама на працадні, чым падрываецца эканоміка калгасаў і падрываецца ў калгаснікаў жаданне працаваць. Мы разумеем, што ў перыяд вайны патрабавалася для забеспячэння арміі больш хлеба, мы з радасцю аддавалі ўсё... не шкадавалі нічога, каб перамагчы ворага. 1945—1946—1947 гг. — неўраджай — таксама здалі ўсё, каб як мага хутчэй аднавіць народную гаспадарку. 1948 г. — мы спадзяваліся, што ў гэтым годзе, выканаўшы дзяржаўны план хлебаздачы, зможам размеркаваць на працадні прыкладна па адным кілаграме. Цяпер мы дзяржаўны план выканалі датэрмінова на 200 %... Але, нягледзячы на гэта, абкам ВКП(б) і райкам давялі нам і ўсім калгасам цвёрдае заданне на звышпланавую здачу, якая перавышае ў некалькі разоў дзяржаўныя планы, таму на працадні размяркоўваць няма чаго, і нават насенне не хопіць засыпаць поўнасцю, каб пасеяць у 1949 г.

Калгаснікі... жывуць у вельмі цяжкіх умовах... хлеб не бачым, жывём на бульбе, а вясной канчаецца і бульба — пераходзім на траву...

*Якімі былі метады кіравання сельскай гаспадаркай, што выкарыстоўваліся ў СССР? Ахарактарызуйце ўзровень жыцця калгаснікаў. Якія вынікі для развіцця сельскай гаспадаркі мела такое кіраванне?*

# § 34. СССР у 1953 г. — сярэдзіне 1960-х гг.

*1. Якімі былі прыярытэты эканамічнага развіцця СССР у 1945—1953 гг.? 2. Які характар мелі адносіны паміж СССР і ЗША пасля Другой сусветнай вайны?*

Цэлая эпоха ў жыцці СССР завяршылася са смерцю І. В. Сталіна. Адсутнасць легітымных механізмаў перадачы вярхоўнай улады вы́клікала зацяжны крызіс і барацьбу ў вышэйшым кіраўніцтве партыі і дзяржавы. Краіна стаяла на парозе вялікіх змен ва ўсіх сферах жыцця.

**СССР пасля смерці І. В. Сталіна.** Пасля смерці І. В. Сталіна паміж яго паплечнікамі разгарнулася жорсткая барацьба за ўладу. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва ўзначалілі *Г. М. Маленкоў* і *Л. П. Берыя*. Абодва лідары выступалі за перадачу ўладных паўнамоцтваў ад партыйных структур да дзяржаўных. Былі спынены ўсе палітычныя працэсы, праведзена ўсеагульная амністыя. Берыя выказваўся за адмену калгаснага ладу і збліжэнне з Захадам.

Аднак у кіраўніцтве партыі пачала складацца змова супраць Берыі, якую ўзначаліў М. С. Хрушчоў, што займаў тады пасаду сакратара ЦК КПСС. У выніку

Правообладатель Издательский центр БГУ



М. С. Хрушчоў

ў чэрвені 1953 г. Л. П. Берыя быў арыштаваны і неўзабаве расстраляны як «вораг народа» і «замежны шпіён». Пасля гэтага на чале ўлады апынуліся Г. М. Малянкоў і М. С. Хрушчоў.

У краіне было адноўлена аднаасобнае кіраванне партыяй. Першым сакратаром Цэнтральнага камітэта КПСС стаў ***М. С. Хрушчоў***, які імкнуўся ператварыць гэту пасаду ў асноўны цэнтр улады. Пасада кіраўніка ўрада, якая з’яўлялася галоўнай у СССР у 1939—1953 гг., страчвала сваё значэнне. У краіне ўзрастала роля партыйнага апарату. У сакавіку 1958 г. Хрушчоў заняў пасаду Старшыні Савета Міністраў СССР. Гэтыя падзеі азнаменавалі канчатковае замацаванне М. С. Хрушчова на чале партыі і дзяржавы.

**XX з’езд КПСС і яго рашэнні.** У перыяд знаходжання пры ўладзе М. С. Хрушчова былі ажыццёўлены важныя палітычныя і эканамічныя рэформы.

№ 33

На *XX з’ездзе КПСС*, што праходзіў у ***лютым 1956 г.***, Хрушчоў зрабіў сакрэтны даклад, у якім выкрываўся культ асобы Сталіна. На І. В. Сталіна ўскладалася ўся адказнасць за рэпрэсіі 1930-х — пачатку 1950-х гг.

Пасля з’езда па ўсёй краіне пачалі зносіць помнікі Сталіну, пераймяноўваць вуліцы і гарады, якія насілі яго імя. Афіцыйная прапаганда паспрабавала выкрасліць імя Сталіна з гісторыі.

У краіне спыніліся палітычныя рэпрэсіі, больш дэмакратычныя адносіны пачалі складвацца і ўнутры партыі. Былі прыняты абноўленыя Асновы крымінальнага заканадаўства, якія адмянялі паняцце «вораг народа», павышалі ўзрост надыходу крымінальнай адказнасці з 14 да 16 гадоў, забаранялі атрыманне прызнання ў час следства шляхам пагроз і насілля. У 1956—1961 гг. было *рэабілітавана* каля 700 тыс. чалавек, у тым ліку шэраг вядомых дзеячаў арміі і партыі.

*XXII з’езд КПСС*, што адбыўся ў *кастрычніку 1961 г.*, зноў асудзіў культ асобы Сталіна. На з’ездзе была прынята новая *Праграма партыі*, арыентаваная на пабудову камунізму ў СССР.

**Рэформы другой паловы 1950-х — першай паловы 1960-х гг.** Значныя змены адбываліся ў эканоміцы. Яшчэ ў 1953 г. Г. М. Малянкоў паставіў пытанне аб павароце эканомікі «тварам да чалавека», аб павелічэнні вытворчасці прадуктаў харчавання і прадметаў народнага спажывання. Такая канцэпцыя эканамічнага развіцця СССР пачала рэалізоўвацца пасля прыходу да ўлады М. С. Хрушчова. У гады сямігодкі (1959—1965) ішло актыўнае будаўніцтва

*Высветліце, што такое ўсесаюзныя ўдарныя камсамольскія будоўлі. Якія аб’екты былі ўзведзены пры актыўным удзеле камсамола?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, а таксама таннага і практычнага жылля. Станоўчыя вынікі гэтага курсу не прымусілі сябе чакаць. Стаў вышэйшым узровень жыцця простых грамадзян. У іх сталі з'яўляцца тэлевізары, халадзільнікі, радыёпрыёмнікі, больш якаснае адзенне. Многія савецкія людзі, якія жылі ў камунальных кватэрах і бараках, атрымалі асобнае жыллё.

Важныя змены адбыліся ў сельскай гаспадарцы. Значна выраслі дзяржаўныя закупачныя цэны на сельгаспрадукцыю. Так, у верасні 1953 г. на малако яны павысіліся ўдвая, на жывёлу і птушку — у 5 разоў. Былі ліквідаваны машынна-трактарныя станцыі, у залежнасці ад якіх знаходзіліся калгасы. Цяпер тэхніка перадавалася непасрэдна ў гаспадарку, праўда, за выкуп па высокай цане. Уводзілася грашовая аплата працы калгаснікаў замест сістэмы аплаты па працаднях. Сяляне пачалі больш зарабляць. У гэты ж перыяд быў адменены падатак на асабістую дапаможную гаспадарку, упершыню ўведзена пенсія для калгаснікаў, ім пачалі выдавацца пашпарты. Прырост сельгаспрадукцыі ў 1953—1958 гг. склаў 34 % у параўнанні з папярэднім пяцігоддзем.

У 1954 г. пачалася праграма асваення *цаліны* — урадлівых неўзараных зямель Казахстана. І хоць многія яе крытыкавалі, але яна дала магчымасць хуткімі тэмпамі павялічыць вытворчасць збожжа і гарантаваць харчовую бяспеку краіны. У канцы 1950-х гг. на цалінных землях вырошчвалася амаль 40 % збожжавых у СССР.

Але ўжо з 1950-х гг. пачалося наступленне на дапаможную гаспадарку. Гэта непрадуманая мера прывяла да абвастрэння харчовай праблемы. Надзеі вырашыць яе з дапамогай павелічэння пасеваў кукурузы не апраўдаліся, паколькі з прычыны скарачэння пасеваў пшаніцы і жыта адбылося агульнае зніжэнне збору збожжавых. Сітуацыю ўскладнілі таксама неўраджаі на цалінных землях у 1962—1963 гг. Пра крызіс сельскай гаспадаркі сведчылі першыя за доўгія гады масавыя закупкі збожжа за мяжой. Рост цэн на харчовыя тавары вы́клікаў масавае незадавальненне людзей. Аўтарытэт улады ў вачах народа стаў падаць.

У той жа час савецкая дзяржава ажыццявіла магутны тэхналагічны прарыў. СССР першым у свеце пабудаваў атамную электрастанцыю (1954), запусціў у космас штучны спадарожнік Зямлі (1957), спусціў на ваду атамны ледакол «Ленін» (1959). ***12 красавіка 1961 г.*** адбыўся першы ў свеце палёт чалавека ў космас. Яго здзейсніў савецкі касманаўт ***Ю. А. Гагарын***. Сапраўдны штурм нязведаных прастораў Сусвету стаў своеасаблівым сімвалам савецкага навукова-тэхнічнага прагрэсу.



Першыя хрушчоўкі, пабудаваныя ў 1956—1958 гг. у Маскве ў раёне Чаромушкі

Правообладатель Издательский центр БГУ



М. С. Хрушчоў і першыя савецкія касманаўты П. Паповіч, Г. Цітоў, А. Нікалаеў, Ю. Гагарын, В. Церашкова, В. Быкоўскі на трыбуне Маўзалея. Масква. 1963 г.

| | |
|---|---|
| **4 кастрычніка 1957 г.** | Запушчаны першы штучны спадарожнік Зямлі |
| **1959 г.** | Савецкі касмічны карабель упершыню дасягнуў Месяца, пакінуўшы на ім вымпел СССР |
| **12 красавіка 1961 г.** | На калязямную арбіту запушчаны першы пілатаваны карабель «Усход» з чалавекам на борце. Палёт здзейсніў Ю. А. Гагарын |
| **6—7 жніўня 1961 г.** | Другі савецкі касманаўт Г. С. Цітоў здзейсніў арбітальны палёт на касмічным караблі «Усход-2» |
| **1962 г.** | Праведзены першы групавы касмічны палёт А. Р. Нікалаева і П. Р. Паповіча |
| **1963 г.** | У космасе пабывала першая жанчына — В. У. Церашкова |

Асваенне космасу ў СССР

Змяненне стаўлення да асобы ў краіне атрымала назву *«адліга»*. Знікла пачуццё страху, так характэрнае для сталінскай эпохі, пачалі шанавацца асноўныя правы і свабоды, у друку з'явіліся смелыя публікацыі.

Нягледзячы на дасягненні, М. С. Хрушчовым было дапушчана нямала сур'ёзных памылак: ***валюнтарызм*** у прыняцці рашэнняў, непаслядоўнасць і частыя хістанні з боку ў бок, пастаянныя перастаноўкі кадраў, што выклікáла незадаволенасць вярхоў партыйнага апарату. У выніку ўпершыню ў гісторыі СССР кіраўнік такога рангу, як М. С. Хрушчоў, быў зняты ў *кастрычніку 1964 г.* з усіх пасад, якія займаў.

**Знешняя палітыка.** Пасля смерці І. В. Сталіна ў СССР назіраліся два розныя падыходы да знешняй палітыкі краіны. Міністр замежных спраў В. М. Молатаў выступаў за захаванне жорсткага супрацьстаяння дзвюх грамадска-палітычных сістэм. Маленкоў, а затым і Хрушчоў лічылі, што ў ядзернае стагоддзе адзіна магчымай асновай міждзяржаўных адносін можа быць *палітыка мірнага суіснавання*.

Правообладатель Издательский центр БГУ

СССР і ЗША пачалі рабіць першыя крокі ў пошуках кампрамісу. У 1958 г. паміж краінамі былі заключаны пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне эканомікі і культуры, а ў наступным годзе ўпершыню ў гісторыі адбыўся візіт лідара СССР у ЗША. Перагаворы на вышэйшым узроўні не прыпынілі «халоднай вайны». Абедзве краіны імкнуліся да аднаасобнага дамінавання ў свеце. У пачатку 1960-х гг. адносіны паміж СССР і ЗША зноў пагоршыліся, дасягнуўшы выбухованебяспечнага стану ў час Карыбскага крызісу.

Сувязь часоў



Закладка Парку Дружбы ўдзельнікамі VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў. Масква. 1 жніўня 1957 г. У 2017 г. Расія прыняла фестываль трэці раз

Супярэчлівы характар мелі адносіны СССР і з краінамі сацыялістычнага блока. З аднаго боку, савецкае кіраўніцтва імкнулася іх развіваць і ўмацоўваць. З іншага боку, яно адкрыта ўмешвалася ва ўнутраныя справы ГДР (1953, 1961), Польшчы (1956), Венгрыі (1956).

Ва ўмовах «халоднай вайны» і крызісу каланіяльнай сістэмы савецкае кіраўніцтва стала надаваць асаблівую ўвагу краінам «трэцяга свету» ў мэтах распаўсюдзіць на іх свой уплыў. У 1957—1964 гг. былі падпісаны больш за 20 дагавораў аб супрацоўніцтве з краінамі Азіі і Афрыкі. Дынамічнае развіццё адносін СССР з Індыяй, Інданезіяй, Бірмай, Афганістанам, Егіптам выклікала занепакоенасць заходніх краін, якія імкнуліся процістаяць росту савецкага ўплыву ў краінах, што сталі на шлях развіцця.

Асаблівы характар мелі адносіны СССР з Кітаем. Кіраўніцтва КНР адмоўна ставілася да выкрыцця культу асобы Сталіна. Яно прэтэндавала на ролю другога лідара ў сацыялістычным лагеры і міжнародным камуністычным руху. Неўзабаве ідэалагічныя рознагалоссі паміж КПСС і Камуністычнай партыяй Кітая негатыўна паўплывалі і на міждзяржаўныя адносіны.

1. Якія змяненні адбыліся ў кіраўніцтве краіны пасля смерці І. В. Сталіна? Што змянілася ва ўнутранай палітыцы? Чаму новае савецкае кіраўніцтва пачало правядзенне рэформаў?
2. Якое значэнне ў гісторыі Савецкага Саюза меў XX з’езд КПСС?
3. Які перыяд у гісторыі СССР называюць «адлігай»? Прывядзіце прыклады праяў «адлігі» ў духоўным і культурным жыцці савецкага грамадства. Выкарыстайце дадатковыя крыніцы інфармацыі.
4. Ахарактарызуйце эканамічнае развіццё СССР у 1953—1964 гг. Што было зроблена ў галіне сацыяльнай палітыкі?

Правообладатель Издательский центр БГУ

5. Вызначце асноўныя напрамкі знешняй палітыкі СССР у другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.
6. У чым заключаўся супярэчлівы характар дзейнасці М. С. Хрушчова?

У цэлым, калі гаварыць пра аб’ектыўныя вынікі палітыкі М. С. Хрушчова, то яна мела масавую падтрымку насельніцтва. Чаму ж яго адстаўка не атрымала ніякага рэзанансу ў савецкім грамадстве?

**З Праграмы КПСС. 1961 г.**

У Савецкай краіне ўвасоблены ў жыццё прынцып сацыялізму: «Ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму — па працы»… Пабудова камуністычнага грамадства стала непасрэднай практычнай задачай савецкага народа.

Галоўная эканамічная задача партыі і савецкага народа — у тым, каб на працягу двух дзесяцігоддзяў стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу камунізму…

Зыходзячы з таго, КПСС намячае павялічыць аб’ём прамысловай прадукцыі:

на працягу бліжэйшых 10 гадоў — прыкладна ў два з паловай разы і перасягнуць узровень прамысловай вытворчасці ЗША;

на працягу 20 гадоў — не менш як у шэсць разоў і пакінуць далёка ззаду цяперашні агульны аб’ём прамысловай вытворчасці ЗША.

*Якая задача была пастаўлена ў Праграме КПСС? Як вы лічыце, ці было рэальным выкананне гэтай задачы?*

## § 35. СССР у сярэдзіне 1960-х — пачатку 1980-х гг.

*1. Якія з’явы ў развіцці эканомікі СССР сведчылі аб неабходнасці правядзення рэформаў? 2. Якія прычыны прывялі да зняцця М. С. Хрушчова? 3. Чым характарызавалася знешняя палітыка СССР у 1953—1964 гг.?*

Пасля зняцця М. С. Хрушчова лідарам СССР стаў ***Л. І. Брэжнеў***, які знаходзіўся на чале ўлады да сваёй смерці ў 1982 г. Гэты перыяд характарызаваўся максімальнай палітычнай і эканамічнай стабільнасцю. Тады былі дасягнуты самы высокі ў гісторыі СССР узровень матэрыяльнага дабрабыту большасці насельніцтва. У той жа час менавіта ў брэжнеўскі перыяд былі закладзены непасрэдныя перадумовы, якія прывялі да распаду СССР.

**Эпоха «развітога сацыялізму».** Брэжнеўскі перыяд у гісторыі СССР называюць эпохай «развітога сацыялізму». Асабліва паспяховымі для СССР былі 1964—1977 гг. У *1965 г.* пачала праводзіцца эканамічная рэформа. Яе ініцыятарам стаў старшыня

Правообладатель Издательский центр БГУ